*Тв.*: Полн. собр. соч. Т. 1—10. СПб.; М., 1897—98; Толковый словарь живого великорусского языка. Т. 1—4. М., 1955; Пословицы русского народа. М., 1957.

*Літ.*: Канкава М.В. Даль как лексикограф. Тбилиси, 1958; Бессараб М.Я. Владимир Даль. 2 изд. М., 1972; Булатов М.А., Порудоминский В.И. Собирал человек слова... М., 1969; Порудоминский В.И. Даль. М., 1971; Ягож. Повесть о «Толковом словаре». М., 1981.

*І. У. Саламевіч.*

**ДАМАВІ́К**, Дамавы, Хатнік, Гаспадар, Падпечнік, міфічны дух дома, які жыве ў хаце (пад печчу ці за печчу) або ў сенцах, каморы, клеці. Паводле павер'яў, у кожнай хаце, сям'і быў свой Д. Ён ахоўваў дом, маёмасць, клапаціўся пра гаспадарку, падтрымліваў агонь, назіраў за побытам, караў вінаватых у сварках, у нядбайнасці. Людзі імкнуліся задобрыць Д.: у памінальныя дні яго клікалі да стала, «частавалі», прасілі не чыніць шкоды, дарогу ад клеці высцілалі белым палатном. Перад пабудоваю дома на чатырох вуглах дзеля ахвяры Д. насыпалі жыта. Воблік і лад існавання Д. ў народзе малявалі ці па чалавечым падабенстве, ці паводле зааморфных уяўленняў. Д. надавалі выгляд старога дзеда ў белай вопратцы з сівой барадой, ці чорнай, пакрытай валасамі чалавекападобнай істоты. Часам гаварылі, што ён падобны на гаспадара хаты. Д. мог успрымацца і ў выглядзе нейкай татэмнай жывёлы: змея, вужа, жабы, ката, сабакі. Паводле некаторых павер'яў, Д. можа ўзнікаць з яйка, знесенага пеўнем (апісана Я.Баршчэўскім у «Шляхціцы Завальні...»), якое трэба 6 месяцаў насіць пад пахай з левага боку, пасля чаго вылупіцца змеяня — Д. У Д. ёсць жонкі — Дамавіхі (*Дамавухі*), ад якіх яны прыжываюць дзяцей — сыноў і дачок. Дарослыя сыны Д. сыходзяць на новыя пабудовы, а дочкі ці выходзяць замуж за іншых Д., ці, застаўшыся ў дзеўках, заляцаюцца да хатніх хлопцаў. Нябачна ад людзей Д. вядуць сваё існаванне: ядуць, п'юць, смуткуюць, радуюцца, нараджаюцца і паміраюць. Вобраз Д. спалучае ў сябе і добрае, і ліхое. Ён увесь час просіць для сябе работу, мые хату, мэблю, песціць жывёлу, прасушвае збожжа, меле зерна па начах. І разам з тым ён нібыта мог прыносіць разлад у сям'ю, неўраджай на ніву, падзеж на скаціну. Верылі, што Д. заязджвае ўночы коней і кароў, душыць і шчыпае сонных гаспадароў, калі яны правінаваціліся, кідае начынне, б'е посуд. Д. да ўсяго ёсць справа, яму блізка ўсё чалавечае. Ён любіць мыцца ў лазні, парыцца. Выходзячы з лазні, пакідалі Д. венік і вядро вады. Вусна-паэтычная традыцыя захавала тэксты замоў, адрасаваных Д.: «Дамавы хазяін і дамавая хазяюшка, прашу вас, упрашываю, малю вас, умаліваю, што ў гэтым доме жывіце, і жывотных не абіжайце», або «Дамавік, дамавік, ідзі шукай лесавіка. Тут табе не бываць, і ўрэда не дзелаць ні схода, ні малода, ні пад поўна, ні маладзіком, ні вавек вяком». У вобразе Д. знайшлі адбітак старажытныя вераванні, *культ продкаў*.

*Літ.*: Беларуская міфалогія / Уклад. У.Васілевіч. Мн., 2002. С. 13—27.

*У. А. Васілевіч.*

**ДАМАВУ́ХА**, дух дома, яго жонка *Дамавічка*. Уяўлялася ў выглядзе нізенькай, тоўсценькай, нібы дзежачка, кабеты сярэдніх гадоў. Ёю падтрымліваўся парадак і лад у хаце добрай гаспадыні. Яна спрыяла ёй у розных гаспадарчых справах, глядзела і калыхала дзяцей, лячыла іх чароўнымі зёлкамі. Чысценькая і акуратненькая, Д. вельмі не любіла нядбайных і неахайных гаспадынь, падкідаючы ў прыгатаваную імі страву свірэпку, пасля чаго ў тых сем'ях адбываліся сваркі і бойкі. Любімымі стравамі Д. былі розная гароднiна, квас, малако, па святах — сала. Ела Д. няшмат, але пільныя гаспадыні прыкмячалі, што ў чыгунку паменшала бульбы, а ў збанку — малака. Пачастункаў Д. не выстаўлялі, бо яна сама ўяўлялася гаспадыняю і магла браць усё, што хацела. Згадвалася на Маладзечаншчыне.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 507—508.

*У. А. Васілевіч.*

**ДАМБАВЕ́ЦКІ** Аляксандр Станіслававіч (1840 — пасля 1914), краязнавец, грамадскі дзеяч. Скончыў Кіеўскі універсітэт. У 1872—93 магілёўскі губернатар, з 1893 сенатар. Ініцыятар адкрыцця ў Магілёве гісторыка-этнаграфічнага музея (1879). Арганізатар ілюстраванага выдання (матэрыял збіраўся паводле яго праграмы) і рэдактар калектыўнай працы «Спроба апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных, прамысловых, сельскагас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ